# Прафесяр Л. А. Шамяткоў — сярод лепшых вучоных стагоддзя

Ганароваму рэктару ГДУ доктару фізіка-матэматычных навук, прафесару, заслужанаму дзеячу навукі Рэспублікі Беларусь, члену-карэспандэнту НАН Беларусі Л. А. Шамяткову прысуджаны сярэбраны медаль “2000 выдатных вучоных XX стагодцзя”, на якім выгравіравана прозвішча ўзнагароджанага. Міжнародны Біяграфічны Цэнтр (г. Кембрыдж, Вялікабрытанія) сёлета адзначыў дасягненні буйнейшых вучоных свету выданнем спецыяльнай кнігі, у якой асвятляецца дзейнасць і прыводзяцца біяграфічныя дадзеныя лепшых вучоных. Саветнікі і спецыяльныя камітэты названага цэнтра разгледзелі дзесяткі тысяч біяграфій і адабралі толькі 2000 з іх для ўключэння ў выдадзеную кнігу. У іх ліку — і Л. А. Шамяткова.

Леанід Аляксандравіч з’яўляецца буйнейшым матэматыкам-алгебраістам. Ён — аўтар трох манаграфій і звыш 100 навуковых прац, якія апублікаваны ў Беларусі, Расіі, Германіі, Іспаніі, Вялікабрытаніі, ЗША. Л. А. Шамяткоў стварыў у Гомелі навуковую матэматычную школу, якая набыла сусветную вядомасць. Сярод яго вучняў — 29 кандыдатаў і 7 дактароў навук. У ГДУ ён узначальвае Савет па абароне доктарскіх дысертацый па матэматычнай логіцы, алгебры і тэорыі лічбаў.

Высокую ўзнагароду Л. А. Шамяткову з вялікім задавальненнем уручыла мэр горада Абердзіна з Шатландыі пані Маргарэт Сміт. Яна выказала ў адрас вучонага шчырыя віншаванні і найлепшыя пажаданні ў далейшай навуковай і педагагічнай дзейнасці.

У. БАЛОГА.

Фота У. ЧЫСЦІКА.